Приложение 3
ПРОЕКТ

УМОВЫ
правядзення V рэспубліканскай выставы сучаснай візуальнай творчасці студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі ”АРТ_АКАДЭМІЯ“

## РАЗДЗЕЛ 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. V рэспубліканская выстава сучаснай візуальнай творчасці студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі ”АРТ_АКАДЭМІЯ“ (далей – рэспубліканская выстава) праводзіцца ў мэтах удасканальвання работы па мастацка-эстэтычнаму выхаванню студэнцкай моладзі, захавання беларускіх нацыянальных традыцый, прапаганды сучасных напрамкаў і лепшых узораў мастацкай творчасці, падтрымкі маладзёжных творчых ініцыятыў.

2. Аснова выставы – манахромная экспазіцыя. Тэма-дэвіз V рэспубліканскай выставы – ”Чырвоны. Апантаныя поспехам“.

## РАЗДЗЕЛ 2
## АРГАНІЗАТАРЫ РЭСПУБЛІКАНСКАЙ ВЫСТАВЫ

3. Арганізатарамі рэспубліканскай выставы з’яўляюцца Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і Установа адукацыі ”Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі“ Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

## РАЗДЗЕЛ 3
## УДЗЕЛЬНІКІ РЭСПУБЛІКАНСКАЙ ВЫСТАВЫ

4. У рэспубліканскай выставе прымаюць удзел асобныя аўтары і творчыя студэнцкія калектывы, аматарскія аб’яднанні, студыі дызайну, фатаграфіі, дэкаратыўна-прыкладной і выяўленчай творчасці, тэатры моды вышэйшых навучальных устаноў.

## РАЗДЗЕЛ 4
## ПАРАДАК ПРАВЯДЗЕННЯ І ЗМЕСТ РЭСПУБЛІКАНСКАЙ ВЫСТАВЫ

5. V рэспубліканская выстава праводзіцца ў красавіку-маі 2012 года па адрасе: г.Мінск, пл. Кастрычніцкая,1, мастацкая галерэя ”Універсітэт культуры“.

6. У рамках рэспубліканскай выставы плануецца правядзенне шэрагу мерапрыемстваў:

урачыстае адкрыццё выставы;

работа экспазіцыі ў інтэрактыўным рэжыме з правядзеннем інсталяцый, дэманстрацый мадэляў адзення, творчых заняткаў;

падвядзенне вынікаў выставы, узнагароджванне пераможцаў і ўдзельнікаў.

7. Рэспубліканская выстава праводзіцца ў намінацыях:

”Захаванне беларускіх нацыянальных традыцый“;

”Арыгінальнае раскрыццё тэмы“;

”Канцэптуальнасць і творчае рашэнне“;

”Дызайн і крэатыўная ідэя“;

”Цэласнасць і змястоўнасць вобраза“;

”Інавацыйная тэхніка выканання“;

”Творчая індывідуальнасць“.

8. Да ўдзелу ў рэспубліканскай выставе выставе прымаюцца работы калектыўнага і індывідуальнага выканання, якія выраблены ў розных відах і тэхніках выяўленчай і дэкаратыўна-прыкладной творчасці: жывапіс, графіка, скульптура, кераміка, мастацкая апрацоўка дрэва, роспіс па шкле, вырабы са скуры, роспіс па тканіне, бацік, бісерапляценне, мастацкая вышыўка, габелен, ткацтва, калекцыі мадэляў адзення, папяровая пластыка; напрамках сучаснай дыгітальнай творчасці: камп’ютэрны дызайн, фота- і відэаарт.

У рамках рэспубліканскай выставы прадугледжваецца ўдзел творчых аб’яднанняў студэнтаў і асобных аўтараў з інтэрактыўнымі дэманстрацыямі, інсталяцыямі і перформансамі.

9. На рэспубліканскую выставу прадстаўляецца не больш за 10 работ ад кожнай навучальнай установы ў адпаведнасці з патрабаваннямі да афармлення (дадатак 3А). Фотаработы дасылаюцца ў друкаваным выглядзе і на электронных носьбітах.

10. Работы на V рэспубліканскую выставу прымаюцца да 30 красавіка 2012 года па адрасе: 220030, г.Мінск, вул.Кірава, 16, Установа адукацыі ”Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі“ Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (з паметкай ”АРТ_АКАДЭМІЯ“).

11. Работы V рэспубліканскай выставы вяртаюцца ў тэрмін не пазней аднаго месяца пасля заканчэння выставы ў адпаведнасці з актам аб прыёмцы.

## РАЗДЗЕЛ 5
## ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ РЭСПУБЛІКАНСКАЙ ВЫСТАВЫ

12. Падвядзенне вынікаў рэспубліканскай выставы ажыццяўляецца экспертнай групай.Экспертная група дае адзнаку прадстаўленым творчым работам і вызначае пераможцаў у намінацыях.

13. Дыпломам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і каштоўным прызам узнагароджваецца ўстанова вышэйшай адукацыі, якая прыняла найбольш актыўны ўдзел у рэспубліканскай выставе.

14. Дыпломамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і каштоўнымі прызамі ўзнагароджваюцца пераможцы ў намінацыях: ”Захаванне беларускіх нацыянальных традыцый“; ”Арыгінальнае раскрыццё тэмы“; ”Канцэптуальнасць і творчае рашэнне“; ”Дызайн і крэатыўная ідэя“; ”Цэласнасць і змястоўнасць вобраза“; ”Інавацыйная тэхніка выканання“; ”Творчая індывідуальнасць“.

15. Дыпломамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і памятнымі прызамі ўзнагароджваюцца аўтары лепшых творчых работ у асобных тэхніках выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, напрамках сучаснай дыгітальнай і візуальнай творчасці.

16. Дыпломамі Установы адукацыі ”Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі“ Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь узнагароджваюцца асобныя аўтары і творчыя калектывы, якія прынялі актыўны ўдзел у рабоце рэспубліканскай выставы.

17. Лепшыя работы будуць экспанавацца на выставе творчых дасягненняў студэнтаў у рамках Рэспубліканскага балю выпускнікоў устаноў вышэйшай адукацыі.

18. Фотаздымкі прадстаўленых работ могуць быць апублікаваны ў сродках масавай інфармацыі і ў звязаных з конкурсам рэкламных матэрыялах.

## РАЗДЗЕЛ 6
## ФІНАНСАВАННЕ РЭСПУБЛІКАНСКАЙ ВЫСТАВЫ

19. Фінансаванне рэпубліканскай выставы ажыццяўляецца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, выдзеленых на правядзенне цэнтралізаваных мерапрыемстваў.

Дадатак 3А

Патрабаванні
да афармлення выставачных экспанатаў

1. Форма заяўкі на ўдзел у рэспубліканскай выставе:
   - назва навучальнай установы;
   - назва творчага калектыву, студыі;
   - прозвішча, імя, імя па бацьку (поўныя) кіраўніка студыі, нумар кантактнага тэлефона;
   - пералік прадстаўленых работ і калекцый з указаннем прозвішча, імя, імя па бацьку (поўныя) аўтараў кожнай работы.

2. Прафесіянальнае афармленне экспанатаў (падрамнікі, рамы).

3. Суправаджэнне экспаната этыкеткай, прыклеенай або прышытай з адваротнага боку работы, памерам 10 см х 5 см.

Узор этыкеткі:

| |
|---|
| ”Мірскі замак“ |
| Лучына Мікалай Пятровіч, 18 год |
| студыя ”Выява“<br>кіраўнік - Паланевіч Святлана Андрэеўна |
| БДПУ імя Максіма Танка |
| факультэт<br>”Педагогікі і методыкі пачатковага навучання“ |